**Расстанні... Дарогі... Сустрэчы...**

Святое мроіцца,
Як фільм нямы:
Усё паўторыцца,
Але не мы.

І нат не восенню,
Не між зімы...
Усё паўторыцца,
Але не мы.

(Алег Лойка. Ушанаванне: Святое мроіцца. Мн., 2001. С.14).

Часам мы жывем, працуем, бачымся амаль штодня ў горадзе, на вуліцы, на факультэце... Але калі мы сустракаемся за межамі факультэта, горада, а тым больш краіны.... у чужой краіне, горадзе, вуліцы, доме, то ўспрыманне, ўражанне пра чалавека зусім іншае, чым там, на радзіме. Далёкае замежжа зближае людзей ці, наадварот, аддаляе... Сапраўды, час і адлегласць выпрабоўваюць нас на адносіны, на сяброўства, на вернасць, на шчырасць... І сапраўднае адчуванне шчасця і радасці прыходзяць тады, калі там, у далёкім замежжы, сустракаешся з даўно знаёмым чалавекам, і гэтыя сустрэчы прыводзяць да новых адкрыццяў у ім: чалавеку-асобе, чалавеку-навукоўцы, чалавеку-паэце, чалавеку-мужчыне...

Слаўныя гэта рэчы,
Слаўна, што ты – госць,
Слаўна, што ёсць сустрэчы,
Нечаканае ёсць:

У Лету ўсё кане,
Адгудзе, як кірмаш,
Ды ўсцяж будзе нечаканае,
Госці будуць усцяж.

Было ўсё, усё і будзе,
Час будзе, як рэчка плыць,
Нечаканыя людзі
Нечаканасць будуць хваліць.

(Алег Лойка. Ушанаванне: Ганне Басавай. С.54).

І гэта ўсё пра мае сустрэчы, расстанні і зноў сустрэчы... з Алегам Антонавічам на нямецкай зямлі, у зямлі Цюрынгія, у горадзе

Ене, у Енскім універсітэце імя Фрыдрыха Шылера, у Інстытуце славістыкі, куды ён на працягу шэрагу гадоў згодна планаў навуковага супрацоўніцтва паміж Белдзяржуніверсітэтам і універсітэтам імя Фрыдрыха Шылера прыязджаў з лекцыямі, з новымі паэтычнымі творамі і з новымі перакладамі нямецкіх пісьменнікаў... да студэнтаў-славістаў і да нас, выкладчыкаў універсітэта. І ўсе мы штогод чакалі чэрвень-ліпень, чакалі прыезду Алега Антонавіча, чакалі сустрэчы з асобай, чакалі сустрэчы з Беларуссю, чакалі сустрэчы з паэзіяй...

О светлыня высокіх нябёсаў
Наймілейшага краю!..
О блаславенства ўдзячнага лёсу,
Якое вас не адбірае!..
(Алег Лойка. Ушанаванне. О светлыня высокіх нябёсаў. С.94).

І сапраўды: “дарога заўсёды таемная – і тая, што за пагорак уцякае, і тая, што за небакраем, па які наш зрок сягае, і асабліва тая, што ў душу вядзе, да самога сябе чалавека і людства вядзе, да духу іх жывога вядзе, а, значыць, да духоўнасці, да боскага ў чалавеку, да Бога ў яго душы ці да яго душы, бласлаўлёнай Богам” (з кнігі Ганса Аўэрсвальда і Алега Лойкі “Сузор’е” (Мінск, 2001. С.4).

Ганна Басава